Такім чынам, нават самы кароткі агляд архітэктуры барока на Беларусі дае падставы сцвярджаць, што яна з'яўляецца самабытнай і каштоўнай часткай сусветнай архітэктурнай спадчыны.

**Кляцкова І.М.,** *выкладчык*

## ВЫКАРЫСТАННЕ РУСКАЙ РЭЛІГІЙНАЙ ФІЛАСОФІІ Ў КУРСЕ КУЛЬТУРАЛОГІІ

Праблема статусу культуралогіі як навучальнай дысцыпліны мае, як нам бачыцца, некалькі аспектаў. Адначасова з вызначэннем прадмета дысцыпліны, выпрацоўкай асноўнага катэгарыяльна-паняційнага апарату, распрацоўкай методыкі выкладання адной з найважнейшых задач з'яўляецца вызначэнне мэт гэтага навучальнага курса. Тут, напэўна, трэба гаварыць аб некалькіх прыярытэтных мэтах, найважнейшай з якіх, на наш погляд, з'яўляецца ўключэнне студэнтаў у агульнакультурны кантэкст як сусветнай, так і нацыянальнай культуры.

Такім чынам, калі адной з прыярытэтных задач культуралогіі з'яўляецца стварэнне шырокай панарамы культурных форм і з'яў і іх магчымага асэнсавання ў тэарэтычных паняццях, то наступным лагічным крокам уяўляецца вызначэнне шэрага персаналій, уключэнне якіх у культуралагічны дыскурс можа быць прызнана заканамерным і мэтазгодным. На наш погляд, руская рэлігійная філасофія (адна з найбольш яркіх з'яў у сусветнай культуры XIX-XX вякоў) павінна быць прадстаўлена ў межах гэтага навучальнага курса. Дастаткова проста пералічыць праблемы, пастаўленыя і ў той ці іншай меры вырашаныя ёю, каб зразумець неабходнасць адлюстравання іх у змесце курса: лёс

рускай інтэлігенцыі, яе адказнасць за лёс Айчыны, яе роля ў станаўленні айчыннай і сусветнай культуры, асэнсаванне развіцця розных культурных форм, маральныя праблемы.

Пытанне аб тым, наколькі шырока варта прадстаўляць рускую рэлігійную філасофію ў навучальным курсе, які не павінен быць тоесны гісторыка-філасофскай дысцыпліне, з'яўляецца зусім не апошнім у спробах вызначыць змест культуралогіі як гуманітарнага прадмета. Адбор некаторых фрагментаў з работ П.Фларэнскага, М.Бярдзяева, Л.Шэстава і ўключэнне гэтых вытрымак у кантэкст канкрэтных тэм дазваляе пазбегнуць сумных вынікаў ужо існуючай у выкладанні культуралогіі практыкі стварэння цэлага калейдаскопа прозвішчаў, якія ўпамінаюцца праз коску і выкарыстоўваюцца па прынцыпу «хто, што і калі сказаў». Наўрад ці можна казаць аб эфектыўнасці такога чыста энцыклапедычнага падыходу. Пытанне наогул трэба ставіць больш шырока — у якой ступені мэтазгодны спробы звесці курс тэорыі культуры да гісторыі культуралагічных канцэпцый.

У якасці прыкладу магчымага ўключэння рускай рэлігійнай думкі ў кантэкст вывучаемых у курсе культуралогіі тэм звернемся да філасофіі П.А.Фларэнскага. З усёй багатай і надзвычай разнастайнай спадчыны гэтага мысліцеля хацелася б вызначыць дзве праблемы, якія маюць самае непасрэднае дачыненне да тэмы нашага артыкула. Перш за ўсё, гэта зварот Фларэнскага да пытання аб адносінах чалавека да ўсяго існага. Ён ураўноўвае анталагічны статус усяго, што створана Богам. Гаворка ідзе аб раўнацэннасці, спрадвечнай раўназначнасці прыроднай істоты і чалавека: «Чалавек звязаны сваім целам з усёй плоццю свету, і сувязь гэта такая цесная, што лёс чалавека і лёс усякага стварэння непарыўны». Такім чынам, Фларэнскі фармулюе канцэптуальныя высновы сапраўды чалавечых, хрысціянскіх адносін да прыроды, здымаючы тым самым папрокі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў бок хрысціянства наконт неапраўданага ўзвышэння чалавека як вянца боскага тварэння. Тут Фларэнскі працягвае распачатую яшчэ Францыскам Асізскім традыцыю, якая накіравана на гарманізацыю адносін чалавека і прыроды: «Гэта не два розныя запаветы, гэта адзін запавет з усім светам, які разглядаецца як адзінае цэлае, што ўзначалена чалавекам».

Зварот Фларэнскага да знака і сімвала ў культуры наогул і ў рускім рэлігійным жывапісе ў прыватнасці — гэта з'ява, значнасць якой цяжка пераацаніць. Больш таго, яснасць і выразнасць выкладання асноўных праблем знакава-сімвалічнай прыроды кананічных твораў мастацтва робяць ягоныя працы па мастацтвазнаўству хрэстаматыйнымі.

У якасці асноватворнага тэзіса Фларэнскі звяртаецца да хрысціянскай ідэі аб падзеленасці ўсяго створанага Богам на свет бачны, яўны, і свет нябачны, няяўны. Паколькі два гэтыя светы розныя, то паўстае пытанне аб мяжы іх судакранання: «... яна і падзяляе, але ж яна іх і злучае». Гэтае метафізічнае, па выразу самога Фларэнскага, пытанне можа ўспрымацца як зыходны пункт у аналізе суадносін паміж кананічным тэкстам (Стары Запавет і Новы Запавет у залежнасці ад разглядаемага сюжэта), як адно з магчымых выяўленняў нябачнага, няяўнага, і кананічным жывапісным тэкстам — праваслаўным іканапісам, увасабленнем вобразаў, даступных толькі ўнутранаму бачанню, у вобразы наяўныя, успрымаемыя чалавечым вокам. Фларэнскі падкрэслівае, што замацаваны ў праваслаўнай культуры сэнс у слове «першавобразы» знаходзіць сваё адлюстраванне ў выяўленчых знаках — «вобразах», але ж сапраўднае раскрыццё духоўнага зместу вобразатвора магчыма толькі «не іначай, як у нашым духоўным узыходжанні «ад вобраза да першавобраза», гэта значыць пры анталагічным судакрананні нашым з самім першавобразам...».

Асаблівую ўвагу Фларэнскі надае прачытанню знакавай сістэмы жывапіснага тэксту іконы. Дзівоснасць, уяўная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няправільнасць перспектыўнай перадачы глыбіні прасторы з'яўляюцца асобымі сродкамі выразнасці ў кананічным жывапісе, надаюць асобае гучанне вобразам: «...калі ж дазволіць сабе часова забыцца пра фармальныя патрабаванні перспектыўнасці, то непасрэднае мастацкае чуццё вядзе кожнага да прызнання перавагі ікон, якія перспектыўнасць парушаюць» (праца П.А.Фларэнскага «Обратная перспектива»).

Фларэнскі звяртае ўвагу на тое, што ў жывапісным тэксце нішто не з'яўляецца выпадковым, што ўсякі жывапісны прыём ёсць выяўленне метафізічнай схемы аб'екта. Прычым метафізічная схема аб'екта прызнаецца больш значнай, чым сапраўдная перадача быцця, праўдападобнасць вобраза. На самай справе, любы вобраз не ёсць падваенне свету, а ёсць спроба вызначыць сапраўднасць вобразатвора праз азначэнне яго пры дапамозе сімвала. Ніякі натуралізм немагчымы ў прынцыпе, як прынцыпова немагчыма падвоіць быццё. Вобразатвор нясе ў сабе разбурэнне формы рэальнага прадмета, які з'яўляецца вытокам творчага натхнення.Мастацтва, згодна з думкай Фларэнскага, стварае не проста сімвалы, а сімвалы сімвалаў.

Сімволіка колеру, кампазіцыя ў праваслаўным іканапісе маюць вялікае значэнне. У старажытным жывапісным творы сумяшчаюцца дзве ўмоўныя сістэмы перадачы вобразатвора: адна — геаметрычная, другая — семантычная.

Відавочна, што ў кожнай карціне ёсць лініі і фігуры, семантычна больш значныя і менш значныя. Першыя знаходзяцца звычайна на пярэднім плане, другія складаюць фон. Семантычна значнымі фігурамі, напрыклад, з'яўляюцца выявы людзей, святых, анёлаў і інш.; відавочна, што прадметы, размешчаныя вакол іх, менш значныя.

Падобная інтэрпрэтацыя жывапіснага тэксту мае «права на жыццё», на наш погляд, не толькі пры прачытанні кананічнага рэлігійнага жывапісу. Усведамленне анталагічнага і семантычна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га статусу мастацкага вобраза дазваляе ўключыць тэксты П.А.Фларэнскага (маюцца на ўвазе перш за ўсё «Обратная перспектива» і «Иконостас») у курс культуралогіі ў якасці класічнага прыкладу аналізу асаблівасцей мастацкай творчасці.

**Смялянская І.І.**, *дацэнт*

## НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫКЛАДАННЯ ФІЛАСОФІІ АСПІРАНТАМ І СУІСКАЛЬНІКАМ

Пошук новых падыходаў да выкладання філасофіі ў ВНУ, у тым ліку аспірантам і суіскальнікам, абумоўлены шэрагам працэсаў сацыяльна-палітычнага, эканамічнага, духоўнага характару, якія адбываюцца ў апошнія гады ў нашым грамадстве. Ёсць даволі рэальная небяспека ідэйна-светапогляднага і каштоўнаснага вакууму ў адносінах да філасофіі. Гэтаму спрыяе характэрная асаблівасць сучаснага цывілізацыйнага развіцця — распад і дыскрэдытацыя розных форм традыцыйнай аўтарытарнай культуры, адмаўленне шырокімі пластамі грамадства (і ў першую чаргу моладдзю) таго, што завецца «рэпрэсіўнай культурай».

Ва ўмовах традыцыйнай аўтарытарна-рэпрэсіўнай культуры моладзь не мела права на свае меркаванні, ёй адназначна адводзілася роля рэцыпіента тых норм і ўстановак, якія задае ёй старэйшае пакаленне. Сучасная моладзь не прызнае аўтаматызму і адмаўляецца ад такога размеркавання роляў. Патрэбна адзначыць, што сітуацыя, якая склалася ў нашым грамадстве ва ўмовах пераходнага перыяду, з усімі яго крызіснымі з'явамі ў духоўнай сферы, параджае небяспечныя і дэструктыўныя эфекты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ